грамадзянскай гісторыі ў зборах Музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні). Мінск, 1993. С. 20–31.
9. АРКР ЦНБ НАН. Ф. 1. Воп. 1. Адз. зах. 384. Лл. 8–10 ; БДАМЛМ. Ф. 518. Воп. 1. Адз. зах. 1018. Арк. 13; Луцкевіч А. Беларускі Музэй ім. Івана Луцкевіча // Гадавік Беларускага навуковага таварыства / Беларус. навук. т-ва. Вільня, 1933. Кн. 1. С. 176–182.
10. LCVA. Ф. R855. Воп. 1. Адз. зах. 2. Арк. 29.
11. LCVA. Ф. R855. Воп. 2. Адз. зах. 19 а.

# КАНЦЭПТ «ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА» (АРХІВА ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ) У АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 1991–2021 ГГ.

***А. М. Латушкін***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030,*

*г. Мінск, Беларусь, Latushkin@bsu.by.*

На прыкладзе гістарычных даследаванняў, праведзеных у Рэспубліцы Беларусь у 1991–2021 гг., аналізуюцца змест і эвалюцыя паняцця «дзяржаўны архіў Вялікага Княства Літоўскага», погляды на структуру і склад дакументальнай спадчыны вялікіх князёў літоўскіх, паняційны апарат вучоных, што прымяняецца да яе ў цэлым і да яе асобных частак – комплексаў, у прыватнасці – да комплекса арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння. Робіцца выснова аб незавершанасці працэса распрацоўкі навуковай тэрміналогіі тэмы. Канстатуецца неабходнасць пераходу да стадый яе ўпарадкавання (гарманізацыі) і ўніфікацыі.

***Ключавыя словы:*** Вялікае Княства Літоўскае; ВКЛ; дзяржаўны архіў ВКЛ; Метрыка ВКЛ; комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння; паняційны апарат гісторыка; тэрміналогія гістарычнай навукі.

# КОНЦЕПТ «ГОСУДАРСТВЕННОГО АРХІВА ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО» (АРХИВА ВЕЛИКИХ КНЯЗЕЙ ЛИТОВСКИХ) В ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ИСТОРИОГРАФИИ 1991–2021 ГГ.

***А. Н. Латушкин***

*Белорусский государственный университет,пр. Независимости, 4, 220030,*

*г. Минск, Беларусь, Latushkin@bsu.by.*

На примере исторических исследований, проведенных в Республике Беларусь в 1991–2021 гг., анализируются содержание и эволюция понятия «государственный архив Великого княжества Литовского», взгляды на структуру и состав документального наследия великих князей литовских, понятийный аппарат учёных, относящийся к нему в целом и к его отдельным частям-комплексам, в частности – к комплексу оригиналов актов общегосударственного значения. Делается вывод о незавершенности процесса разработки научной терминологии темы. Констатируется необходимость перехода к этапам его упорядочения (гармонизации) и унификации.

***Ключевые слова:*** Великое княжество Литовское; ВКЛ; государственный архив Великого княжества Литовского; метрика ВКЛ; комплекс оригиналов актов абщегосударственного значения; понятийный аппарат историка; терминология исторической науки.

# THE CONCEPT OF THE «STATE ARCHIVE OF THE GRAND PRINCIPALITY OF LITHUANIA» (ARCHIVE OF THE GRAND DUKES OF LITHUANIA) IN BELARUSSIAN HISTORIOGRAPHY 1991–2021

***A. N. Latushkin***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030,*

*Minsk, Republic of Belarus, Latushkin@bsu.by*

On the example of historical research conducted in the Republic of Belarus in 1991–2021. the content and evolution of the concept of «the state archive of the Grand Duchy of Lithuania», views on the structure and composition of the documentary heritage of the Grand Dukes of Lithuania, the conceptual apparatus of scientists related to it as a whole and to its parts-complexes, in particular - to the complex of original acts of national significance are analyzed . The conclusion is made about the incompleteness of the process of developing the scientific terminology of the topic. The necessity of transition to the stages of its streamlining (harmonization) and unification is stated.

***Keywords:*** Grand Duchy of Lithuania; GDL; State Archive of the Grand Duchy of Lithuania; metric GDL; complex of original acts of the ollstate significance; the conceptual apparatus of the historian; terminology of historical science.

Паняцце «дзяржаўны архіў Вялікага Княства Літоўскага», якое аформілася яшчэ ў дарэвалюцыйнай гістарычнай навуцы Расійскай імперыі, у першай палове XX ст. пранікае ў беларускую нацыянальную гістарыяграфію і паступова набывае рысы ўстойлівага канцэпту. Першапачаткова яго значэнне зводзілася да Метрыкі ВКЛ. Аднак пазней па меры развіцця ў СССР і за мяжой даследаванняў у галіне «метрыцыяны» структура і змест паняцця эвалюцыянавалі, паступова перамяшчаючы акцэнт на т. зв. «комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва вялікіх князёў літоўскіх» («архіва Вялікага Княства Літоўскага»). Пад ім трэба разумець сукупнасць дакументаў заканадаўчага характару ў форме арыгіналаў, выдадзеных ад імя манарха ці саслоўна-прадстаўнічых органаў дзяржавы, дзеянне якіх распаўсюджвалася на ўсю тэрыторыю ВКЛ або на асобныя групы яго насельніцтва ці тэрытарыяльна-адміністрацыйныя адзінкі, а таксама дакументы, адрасатам якіх выступалі вялікія князі літоўскія або ВКЛ у цэлым. Да іх адносіліся: пагадненні аб вечным міры, перамір'і, саюзе паміж ВКЛ і замежнымі дзяржавамі; агульназемскія прывілеі ВКЛ; булы і брэвэ рымскіх пап, адрасаваныя вялікім князям літоўскім; і іншыя віды актаў.

За перыяд 1991–2021 гг. айчынная гістарыяграфія дадзенай тэмы прайшла значны шлях развіцця. У ёй адлюстраваліся тыя супярэчнасці, якія сфарміраваліся ў межах савецкай гістарычнай навукі і архівазнаўства к канцу 1980-х – пачатку 1990-х гг., былі прапанаваныя шляхі іх вырашэння, з’явіліся новыя тэндэнцыі ў распрацоўцы самой праблемы і яе тэрміналагічных аспектаў. Разам з тым неабходна канстатаваць, што за апошнія 30 год узнікла параўнальна няшмат прац беларускіх вучоных, якія б непасрэдна датычыліся назвы, структуры і складу такога аб’екта, як комплекс арыгіналаў, ды і самаго «архіва вялікіх князёў літоўскіх», «архіва Вялікага Княства Літоўскага», «дзяржаўнага архіва ВКЛ». Пераважная большасць даследаванняў арыентавалася на тыя або іншыя аспекты тэмы «метрыцыяны».

Важнае месца ў гістарыяграфіі тэмы 1990-х гг. заняў канцэптуальны артыкул доктара гістарычных навук Г. Я. Галенчанкі, падрыхтаваны ў суаўтарстве з кандыдатам гістарычных навук М. Ф. Спірыдонавым пад назвай «Метрыка Вялікага Княства Літоўскага» і змешчаны ў 5-м томе «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (1999) [4]. Пазней яго тэкст фактычна без змен быў паўтораны ў выданні «Вялікае Княства Літоўскае: энцыклапедыя» [5]. Даны тэкст сімвалізуе сабой новы этап у развіцці тэмы ў айчыннай гістарыяграфіі, а менавіта – замацаванне на навукова-энцыклапедычным узроўні, гэта значыць як прызнанага факту, статусу комплекса аргыіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ як самастойнага адносна Метрыкі ВКЛ і акрэсліванне абодвух аб’ектаў як асобных частак «дзяржаўнага архіва ВКЛ». Так, аўтары ўказвалі на існаванне ў ВКЛ такога збора дакументаў, як «вялікакняжацкі, а пазней галоўны дзяржаўны архіў ВКЛ». Яго структура прадстаўлялася імі так: 1) Метрыка ВКЛ – аснова; 2) арыгіналы актаў – самастойная складовая частка збора. Прасторай, якая іх аб’ядноўвала на розных этапах жыццёвага цыкла, выступала таксама гаспадарская або вялікакняжацкая, дзяржаўная канцылярыя ВКЛ, а таксама – «вялікакняжацкі скарб». У сувязі з чым абазначэнне «дакументы вялікакняжацкай канцылярыі» магло выступаць у аўтараў агульным для абедзвух названых частак. Пры характарыстыцы прыроды Метрыкі ВКЛ як з’явы вучонымі падкрэслівалася яе юрыдычна-рэгістрацыйная (нотафікацыйная) функцыя. Форма – капіярый [4, с. 121]. Назва «Метрыка Вялікага Княства Літоўскага» была прадстаўлена як афіцыйная для свайго часу. Існуючы ў навуцы падыход, згодна з якім арыгіналы актаў уключаліся ў склад Метрыкі ВКЛ, а яна сама

атаясамлялася з «дзяржаўным архівам ВКЛ», быў прадстаўлены вучонымі як неабгрунтаваны [4, с. 123].

У 2014 г. у спецыяльнай працы, прысвечанай Метрыцы ВКЛ, Г. Я. Галенчанка фактычна паўтарае прыведзеныя ім у энцыклапедычных артыкулах погляды. Акрамя таго, ён асобна звяртае ўвагу на тэрміналогію праблемы, дзе яшчэ раз сцвярджае, што арыгіналы актаў нельга лічыць часткай Метрыкі ВКЛ, акрэслівае іх як «адасобленыя зборы арыгінальных актаў», аддаючы перавагу паняццю «арыгінал» [3, с. 4, 6]. Прыкмета агульнадзяржаўнага значэння прававога акта ў тым жа выданні перадаецца праз словызлучэнне «агульнадзяржаўны акт», «агульназемскі акт» [3, с. 6, 12].

Аналіз прац Г. Я. Галенчанкі сведчыць, што тэрміны «гаспадарскі архіў ВКЛ», «вялікакняжацкі архіў ВКЛ», «дзяржаўны архіў ВКЛ» ім ужываюцца ў наступным сэнсе: збор дакументаў, які меў агульнадзяржаўнае значэнне, знаходзіўся ў дзяржаўнай уласнасці, уключаў у сябе як Метрыку ВКЛ, так і арыгіналы прававых актаў агульнадзяржаўнага маштабу дзеяння, унутрана- і знешнепалітычнага характару, а таксама дакументы, што адносіліся да ўладанняў дзяржаўнага зямельнага фонду. Падаецца, таксама, што прымяненне таго або іншага тэрміна залежыла ад часу, да якога адносіўся сам аб'ект, эта значыць названы архіў эвалюцыянаваў ад «гаспадарскага» на ранніх этапах развіцця дзяржавы да «дзяржаўнага» архіва напрыканцы XVIII ст., калі з прычыны выхаду з валодання дзяржавай комплекса арыгіналаў, а таксама яго частковай страты дамінуючага становішча ў змесце гэтага паняцця Метрыка заняла ВКЛ.

У 1999 г. свой падыход да тэрміна «дзяржаўны архіў ВКЛ» аформіў адзін з найбуйнейшых беларускіх дакументазнаўцаў А. Я. Рыбакоў. Першым у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі ён прымяніў назву «дзяржаўны архіў ВКЛ» непасрэдна ў дачыненні да комплекса арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ. Адначасова як сінонімы ён ужываў назвы «архіў ВКЛ», «вялікакняскі архіў». У працах вучонага мы фактычна назіраем адзіны прыклад трансляцыі падыходу літоўскага гісторыка Э. Д. Баніёніса (1948–1993) у беларускай гістарыяграфіі, тэзісна акрэсленага апошнім у 1990 г. у артыкуле «Литовская метрика и Архив Великого Княжества Литовского» [2]. Праз 9 гадоў А. Я. Рыбакоў адназначна сцвярджаў наступнае: «Дзяржаўны архіў складаўся *толькі з сапраўдных дакументаў* [выдзелена намі. – *А. Л.*] і доўгі час фарміраваўся адначасова і як асабісты архіў вялікага князя»; «Адзінае, што аб'ядноўвала дзяржаўны архіў, архіў канцылярыі і скарбавы архіў – месца захоўвання,

якім быў скарб» [26, с. 74]. Ён супрацьпастаўляецца зборам «ведамаснага» характару – архівам абедзвух канцылярый у форме кніг так званай вялікай і малой Метрыкі ВКЛ, земскага скарбу ВКЛ і інш. Асноватворныя прыкметы комплекса арыгіналаў актаў архіва ВКЛ, такія як «арыгінал» і «агульнадзяржаўнае значэнне акта», вучоны абазначаў на беларускай мове праз наступныя аўтарскія тэрміны. Першы з іх – «сапраўдны акт», «сапраўдны дакумент». У А. Я. Рыбакова гэта абазначэнне з’яўляецца прамым перакладам з рускай мовы слова «подлинник», цалкам супадае па значэнні з паняццем «арыгінал», ужываецца як супрацьвага капійнаму характару актаў Метрыкі ВКЛ. Другі тэрмін – «агульнадзяржаўны акт», «акт дзяржаўнага значэння» [25; 26]. Важнай рысай поглядаў даследчыка з’яўлялася ўключэнне ў склад архіва не толькі заканадаўчых актаў агульнадзяржаўнага значэння, але таксама і дакументаў маёмасна-прававога характару, якія адносіліся да зямельных уладанняў, што вярнуліся ў зямельны фонд дзяржавы, так званыя вымарачныя або атрыманыя іншымі шляхамі маёнткі.

Разам з тым, па сцвярджэнні А. Я. Рыбакова, структура і склад «дзяржаўнага архіва» былі складанымі і на працягу XVI–XVIII ст. змяняліся. Так, «дзяржаўным архівам» ён таксама называе архіў, які фарміруецца пасля падзей сярэдзіны XVII ст. у ВКЛ з некалькіх элементаў: з кніг Метрыкі ВКЛ, скапіяваных у канцы XVI – пач. XVII ст., і тых, што прадаўжалі ствараццца; з ацалелых арыгіналаў актаў; з іншых дакументаў, якія засталіся пасля страты ўласна «дзяржаўнага архіва ВКЛ» у выніку заваладання яго часткай Радзівіламі і страты так званай «старой Метрыкі» падчас вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. Гэта ўжо быў архіў, дзе метрыкальная частка выступала асновай [25, с. 173; 26, с. 75–76]. Акрамя азначанага, А. Я. Рыбакоў услед за Г. Я. Галенчанкам прызнае і падкрэслівае факт неапраўданай экстрапаляцыі назвы «Літоўская Метрыка» на ўсю архіўную спадчыну ВКЛ у Расіі ў канцы XVIII – XIX ст.

Аднак тэрміналагічныя падыходы А. Я. Рыбакова – эвалюцыянавалі. У 2000 г. даследчык сцвярджаў: «Первые выводы о структуре и содержании *архива ВКЛ* можно сделать применительно к XVI в. В это время он состоял из двух основных частей: *подлинных актов* и *копийных книг*, которые вела государственная канцелярия» *[*выдзелена намі. – *А. Л.]* [25, с. 170]. Як можна заўважыць, змест тэрміна «архіў ВКЛ» у кантэксце падзей XVI ст. ужо выступае двухскладовым. Комплекс арыгіналаў актаў, які раней ён абазначаў на гэты перыяд як уласна «дзяржаўны архіў», у сваім дакладзе вучоны прадстаўляе ўжо як «архіў сапраўдных актаў», «дзяржаўны архіў

сапраўдных актаў» («архив подлинных актов», «государственный архив подлинных актов») [25, с. 171]. У першай палове XVII ст. комплекс дакументаў маёмасна-прававога характару губляе практычнае значэнне і разам з кнігамі так званай старой Метрыкі ВКЛ становіцца, па словах вучонага, своеасаблівым «гістарычным архівам». Згодна з тагачаснымі ўяўленнямі гісторыка, комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння ў гэты час захоўваўся асобна ад іх, што зараз ужо можна аспрэчыць [28; 15].

Важную ролю ў даследаваннях тэмы Метрыкі ВКЛ і комплекса арыгіналаў актаў архіва ВКЛ займаюць працы доктара гістарычных навук А. І. Грушы. У кнізе «Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага 40-х гг. XV – першай паловы XVI ст. » (2006) аўтар канцэнтруе сваю ўвагу найперш на Метрыцы ВКЛ. У дачыненні да элеменаў комплекса арыгіналаў актаў ён аперуе такім паняццем, як «арыгінал». Да апошніх ім аднесены, напрыклад, «арыгіналы міжнародных дагавароў», «прывілеі ВКЛ», «перапісы ўсяго войска ВКЛ і войска ВКЛ, апрача перапісу 1528 г.». У разуменні даследчыка, арыгіналы – адасоблены ад Метрыкі ВКЛ. Месца захоўвання першых – скарб, другіх – канцылярыя (нават у XV ст.). Пры гэтым вучоны падзяляў погляды М. К. Любаўскага на пытанне дзяржаўнага архіва ВКЛ [6, с. 30–33].

У пазнейшых даследаваннях А. І. Грушы, праведзеных у межах падрыхтоўскі доктарскай дысертацыі, погляд на Метрыку ВКЛ як на дзяржаўны архіў ВКЛ падвяргаецца пераасэнсаванню. Падставай гэтага вучоны называе існаванне іншых комплексаў актаў, у прыватнасці менавіта тых, што захоўваліся ў земскім скарбе ВКЛ: «Метрику часто называют государственным архивом ВКЛ. Это определение неточное (поскольку кроме Метрики существовали и другие архивные комплексы, например, хранимые в скарбе, см. 10. 1. 8 Великокняжеский архив) и слишком общее. Оно не отражает сложную специфику этих письменных материалов» [8, с. 270]. Гэта былі, уласна, арыгіналы актаў агульнадзяржаўнага значэння, а таксама іншыя дакументы, у тым ліку – маёмасна-прававога характару [8, с. 358]. Адметна, што разглядаючы даны збор, А. І. Груша са спасылкай на працы польскіх гісторыкаў, спецыялістаў у тэме – Я. Б. Якубоўскага, С. Я. Кутшэбы і У. А. Сямковіча, В. Мікульскага – наўпрост называе даны комплекс «архівам скарба» [8, с. 358, спасылка 1574]. Ён жа, ва ўяўленні даследчыка, – і ёсць «вялікакняжацкі архіў», «гаспадарскі архіў», «архіў гаспадара», «збор дакументаў вялікага князя». Склад менавіта гэтага

комплексу часткова раскрывае знакаміты вопіс 1570–1584 гг., які вучоны называе «вопісам вялікакняжацкага архіва» [8, с. 358].

Аднак абмежаванне зместу тэрміну «вялікакняжацкі архіў» выключна арыгіналамі актаў, што захоўваліся ў земскім скарбе дзяржавы, дысануе з іншымі сцвярджэннямі аўтара. Яны вымушаюць разумець значэнне тэрміна «вялікакняжацкі архіў» (руск. – «великокняжеский архив») як пэўную сукупнасць дакументаў, незалежна ад іх месца захоўвання. Гэта значыць, тэарэтычна такая трактоўка дапускае пашырэнне гэтага паняцця і на Метрыку ВКЛ [8, с. 361]. Даследчык адзначаў, што акрамя арыгіналаў даны архіў (у тэксце ў гэтым месцы – «собрание документов великого князя») утрымліваў і копіі, быў архівам як выходных, так і ўваходных дакументаў. Яны мелі форму як асобных дакументаў, так і кніг [8, с. 358]. Са спасылкай на П. Кенэдзі Грымстэд і С. В. Думіна А. І. Груша падтрымлівае погляд на неабходнасць адрознівання розных «комплексаў» унутры «вялікакняжацкага архіва». Пад імі ён разумее перш за ўсё дакументы, якія захоўваліся ў скарбе, і кнігі Метрыкі ВКЛ, якія захоўваліся ў канцылярыі. Усё гэта, на яго погляд, – часткі аднаго архіва [8, с. 359]. Храналагічныя межы, на якія вучоны распаўсюджвае свае высновы, гэта пераважна канец XIV – першая трэць XVI ст., а асобныя з іх сягаюць другой паловы XVI ст. Фактычна ўсе прыведзеныя вышэй палажэнні А. І. Грушы паўтораныя ў перавыданні яго кнігі [7, с. 320–333, 424–430].

Цытаванымі даследваннямі кола прац у беларускай гістарыяграфіі першых двух дзесяцігодзяў XXI ст., дзе спецыяльна б закраналася тэма архіўнай спадчыны вялікіх князёў літоўскіх, комплекс арыгіналаў актаў архіва ВКЛ, не вычэрпваецца. Аўтары пераважна занялі пазіцыю, якая адпавядала падыходу, што сфарміраваўся на той час у айчыннай і ў замежнай навуцы, згодна з якім «дзяржаўны архіў ВКЛ» або «архіў ВКЛ» – шматкампанентная структура, у межах якой комплекс арыгіналаў – самастойная, найстаражытнейшая і надзвычай каштоўная для дзяржавы яго частка (А. А. Радаман, А. У. Ліцкевіч) [23; 24; 16; 17; 18; 19].

У 2015 г. пабачыла свет выданне «Помнікі права Беларусі XIV–XVI стст.: агульназемскія прывілеі і акты дзяржаўных уній. Крыніцазнаўчы дапаможнік». Дакументы і тэксты, якія былі апублікаваныя ў ім, у сваёй масе ўваходзілі ў склад комплекса арыгіналаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ і ўяўлялі сабой два найважнейшыя і найбольш шматлікія іх віды. Разам з тым, архіўны лёс самага комплекса, як некалі цэласнага збора, у працы, на жаль, не раскрываецца. На гэта толькі сцісла ўказваюць ранейшыя месцы захоўвання асобных актаў. Сярод згадак, аднак, фіксуецца

«дзяржаўны архіў ВКЛ» (!), а таксама прыватныя зборы князёў Радзівілаў у Нясвіжы і Нябораве [22, с. 34, 40, 49, 62, 158, 210, 220, 251, 309].

У той жа час у Беларусі з пачатку 2000-х гг. прадаўжала ўкараняцца трактоўка самой Метрыкі ВКЛ, як «ведамаснага» архіва («архіў канцылярыі Вялікага Князя Літоўскага», «архіў канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага») [21, с. 1, 11; 1, с. 3–5, 105]. На гэты факт як на альтэрнатыву, падтрыманую беларускімі гісторыкамі, звяртала ўвагу найбуйнейшы спецыяліст у галіне «метрыцыяны» Г. Л. Харашкевіч [цыт. па: 20, с. 452; 27, с. 28]. Пры гэтым на Метрыку ВКЛ выразна глядзелі, як на збор «актавых кніг вялікакняжацкай канцылярыі» і як на адзін з кампанентаў больш шырокай сукупнасці дакументаў дзяржавы, асобны ад «калекцыі пергамінавых прывілеяў і актаў» – комплекса арыгіналаў [1, с. 37–38]. Разам з тым, за Метрыкай ВКЛ захоўвалася роля «цэнтральнага» ці «галоўнага» архіва дзяржавы, у прыватнасці, у дачыненні да стану на XVIII ст. [1, с. 135, 136]. Нягледзячы на гэта, тэндэнцыя ва ўяўленнях аб Метрыцы ВКЛ як аб ведамасным архіве дзяржаўн(ай/ых) канцыляры(і/й) з адпаведным выражэннем гэтага погляду ў тэрміналогіі тэмы, тым не менш, не выцесніла ранейшага падыходу ў гістарыяграфіі да яе як да «дзяржаўнага архіва ВКЛ». Напрыканцы разглядаемага перыяду ў працах асобных аўтарытэтных беларускіх вучоных яна зноў фігуруе пад такой назвай (руск. – «государственный архив Великого Княжества Литовского»), а перыяд другой паловы XVIII ст. трактуецца як «этап суверэннага існавання Метрыкі ВКЛ як дзяржаўнага архіва» (А. І. Дзярновіч) [13]. У значнай ступені гэта было абумоўлена знаходкамі новых крыніц па гісторыі Метрыкі ВКЛ, кароткай гісторыяй іх крытыкі і адсутнасцю даных аб іншых частках архіва вялікіх князёў літоўскіх. Аднак адметна тое, што падобны падыход зафіксуецца і на ўзроўні акадэмічных калектыўных выданняў канца разглядаемага перыяду. Знакавай у гэтым сэнсе выступае шматтомная праца «История белорусской государственности». Перыяд да канца XVIII ст. прадстаўлены ў першым томе выдання [14]. Стваральнікі выдання ў якасці «дзяржаўнага архіва» разглядаюць выключна Метрыку ВКЛ з копіямі дакументаў у сваім складзе. Аўтары сцвярджаюць: «Для изучения истории государственности ВКЛ и Беларуси в его составе важнейшим источниковым комплексом являются документы *государственного архива – Метрики Великого княжества Литовского* XV–XVIII вв. Здесь сохранились копии документов, изданных от имени великого князя, рады, соймов, материалы дипломатического характера и др.» [выдзелена намі. – *А. Л.]* [14, с. 54]. На жаль, мы не знаходзім у працы

звестак аб іншых частках збору, хоць акты уній, міждзяржаўныя пагадненні аб міры і перамір'і, заканадаўчыя акты ў форме агульназемскіх прывілеяў і інш. фігуруюць у адпаведных раздзелах даследавання, але толькі як асобныя аб'екты вывучэння, гістарычныя крыніцы, ілюстратыўны матэрыял [14, с. 257–279, 364–384, 443–466]. Аўтары фактычна не закранаюць архівазнаўчага аспекта (архіў – атрыбут дзяржаўнасці) у працэсах дзяржаўнага будаўніцтва на беларускіх землях. Высновы аб месцы дакументальнай спадчыны ВКЛ у гістарычным лёсе беларускага народа, аб ролі ў ім архіва вялікіх князёў літоўскіх – гэтага ўнікальнага дакументальна-прававога помніка беларускай дзяржаўнасці і культуры – у працы выявіць не ўдалося. Гэта сцвярджэнне за цытаваным выключэннем датычыцца і Метрыкі ВКЛ.

Адначасова можна ўсё ж заўважыць, што аўтар апошніх сістэматычных даследаванняў дзейнасці вышэйшых органаў дзяржаўнай улады ВКЛ у XVIII ст., у тым ліку Вялікай і Малой («меншай») дзяржаўных канцылярый, гісторыі Метрыкі ВКЛ у азначаны перыяд па ранейшаму тэзіс аб ведамасным характары названага комплекса падцвярджае (К. П. Дзярновіч) [9; 10; 11; 12].

Такім чынам, на цяперашні момант у межах сучаснай айчыннай гістарыяграфіі тэмы яшчэ захоўваецца пэўная варыянтнасць і адсутнасць паслядоўнасці ў прымяненні тэрміналогіі. Сярод асноўных падыходаў дамінуе ўяўленне аб тым, што Метрыка ВКЛ і комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння – асобныя самастойныя комплексы «дзяржаўнага архіва ВКЛ», «архіва ВКЛ». Пры гэтым другі з іх выразна асацыюецца з архівам вялікіх князёў літоўскіх і звязваецца з «вялікакняжацкім», пазней – земскім скарбам ВКЛ як асноўным месцам захоўвання. Трэцім комплексам пры гэтым выступалі акты маёмасна-прававога характару на зямельныя ўладанні, што вярнуліся ў валоданне дзяржавы. Манапалізацыя Метрыкай ВКЛ паняцця «дзяржаўнага архіва ВКЛ» тлумачыцца прычынай нізкай ступені захаванасці другога з названых комплексаў і амаль поўнай стратай трэцяга з іх падчас вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. Разам з тым, выпадкі інтэрпрэтацыі менавіта Метрыкі ВКЛ як «дзяржаўнага архіва ВКЛ» без увагі да такога элемента ў яго структуры, як комплекс арыгіналаў актаў, усё яшчэ маюць месца. Характэрнай рысай айчыннай гістарыяграфіі з'яўляецца выкарыстанне ў адносінах да дакументаў комплексу адначасова двух паняццяў – «сапраўдны акт», руск. – «подлинник» у значэнні «арыгінал», і ўласна «арыгінал». У цяперашні час адзіны падыход да назвы комплексу

арыгіналаў актаў, да зместу паняццяў «дзяржаўны архіў ВКЛ», «архіў ВКЛ», «архіў вялікіх князёў літоўскіх» і вытворных ад іх у беларускай гістарычнай навуцы канчаткова не выпрацаваны.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Актуальныя пытанні вывучэння і выдання Метрыкі Вялікага княства Літоўскага: Матэрыялы міжнар. навук. -практ. канф., Мінск, 11–12 ліст. 2003 г. / Ін-т гіст. НАН Беларусі; рэдкал. С. П. Віцязь і інш. Мінск: Ін-т гіст. НАН Беларусі, 2005.
2. Банёнис Э. Д. Литовская метрика и Архив Великого Княжества Литовского // Спорные вопросы отечественной истории XI–XVIII веков: тезизы докладов и сообщений Первых чтений, посвященных памяти А. А. Зимина, Москва, 13–18 мая 1990 г. М.: Институт истории СССР, 1990. Ч. I. С. 27–29.
3. Галенчанка Г. Я. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: гісторыя, даследаванні, выданні (кароткі нарыс). Мінск: БелНДІДАС, 2014.
4. Галенчанка Г. Я., Спірыдонаў М. Ф. Метрыка Вялікага княства Літоўскага // Энцыкл. гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]. Мінск: БелЭн, 1993–2003. Т. 5: М–Пуд. 1999. С. 121–128.
5. Галенчанка Г. Я., Спірыдонаў М. Ф. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага // Вялікае княства Літоўскае: энцыкл.: у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: БелЭн, 2005–2006. Т. 2. 2007. С. 302–310.
6. Груша А. І. Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага 40-х гадоў XV – першай паловы XVI ст. Мінск: Беларуская навука, 2006.
7. Груша А. И. Кризис доверия? Появление и утверждение правового документа в Великом Княжестве Литовском (конец XIV – первая треть XVI в.). М.; СПб.: Центр гуманитарных ининциатив, 2019.
8. Груша А. И. Документальная письменность Великого Княжества Литовского (конец XIV – первая треть XVI в.). Минск: Беларуская навука, 2015.
9. Дернович Е. П. Государственная канцелярия Великого Княжества Литовского в XVIII веке // Архівы і справаводства. 2020. № 3. С. 144–156.
10. Дернович Е. П. Королевский привилей 1720 года меньшей канцелярии Великого Княжества Литовского // Беларускі археаграфічны штогоднік. 2021. Вып. 22. С. 142–146.
11. Дернович Е. П. Порядок создания документов в канцелярии Великого Княжества Литовского в XVIII веке // Архівы і справаводства. 2020. № 2. С. 145–153.
12. Дернович Е. П. Формирование и оформление актовых книг большей и меньшей канцелярий в Великом Княжестве Литовском в XVIII веке // Архівы і справаводства. 2021. № 6. С. 37–45.
13. Дернович О. И. Инвентарь «Книг Метрики ВКЛ по-новому переплетенный и составленный» Григорием Качановским (1787 г.): источник по истории государственного архива Великого Княжества Литовского // Lietuvos statutos ir Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės bajoriškoji visuomenė. Straipsnių rinkinys. Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 2015. P. 261–276.
14. История белорусской государственности: в 5 т. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.]; отв. ред. тома: О. Н. Левко, В. Ф. Голубев; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. Минск: Беларуская навука, 2018.
15. Латушкін А. М. Рэестр дзяржаўнага архіва Вялікага Княства Літоўскага ад 26 лістапада 1623 г. і яго значэнне для рэканструкцыі складу комплекса арыгіналаў актаў

кан. XIV – пач. XVII стст. // Беларускі археаграфічны штогоднік. 2017. Вып. 18. С. 247–264.
16. Лицкевич О. В. «Летописец великих князей литовских» и «Повесть о Подолье»: опыт комплексного критического разбора. СПб.: Дмитрий Буланин, 2019. (Studiorum slavicorum orbis; вып. 16).
17. Лицкевич О. В. Ольгердиана: о некоторых фальсификатах и утраченных документах Великого княжества Литовского (литовско-московских договорах 1340–1380-х гг.) // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Мінск. 2011. Вып. 13. С. 87–108.
18. Ліцкевіч А. У. Дагаворы паміж князямі ВКЛ, нобілямі Жамойці і прадстаўнікамі Тэўтонскага ордэна ў Прусіі і Лівоніі (1367–1398 гг.) // Arche. 2010. № 10. С. 39–123.
19. Ліцкевіч А. У. Старабеларускія граматы XV ст. з Archiwum głównego akt dawnych у Варшаве // Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. Мінск. 2009. Вып. 11. С. 6–41.
20. Менжинский В. С. Метрика Великого княжества Литовского в трудах А. Л. Хорошкевич // От Древней Руси к России нового времени. Сборник статей к 70-летию Анны Леонидовны Хорошкевич. Москва: Наука, 2003. С. 449–453.
21. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага = Metrica of the Grand Duchy of Lithuania. Кніга 28 (1522–1552). Кніга запісаў 28 (Копія канца XVI ст.) / Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі; падрыхт. тэксту да друку і навук. апарат: В. Мянжынскі, У. Свяжынскі. Мінск: Atheneum, 2000.
22. Помнікі права Беларусі XIV–XVI стст.: агульназемскія прывілеі і акты дзяржаўных уній. Крыніцазнаўчы дапаможнік / склад: Г. Я. Галенчанка, А. А. Жлутка, А. А. Мяцельскі [і інш.]. Мінск: БелНДІДАС, 2015.
23. Радаман А. А. Віленскі земскі прывилей 1565 г. вялікага князя Жыгімонта Аўгуста // Беларускі гістарычны агляд. 2005. Т. 12. Сш. 1–2. С. 132–161.
24. Радаман А. А. Сістэматызацыя права ВКЛ і пытанне папраўы Трэцяга Статута ВКЛ на сойміках Навагародскага ваяводства ў 1587–1632 гг. // Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя. 2018. № 2. С. 21–31.
25. Рыбаков А. Е. Государственный архив ВКЛ: попытка реконструкции // Архівы Беларусі на рубяжы XX–XXI стст.: гісторыя, стан, перспектывы развіцця: Матэрыялы міжнар. навук. -практ. канф. 8–9 лют. 2000 г. / Дзярж. кам. па арх. і справаводству Рэсп. Беларусь. БелНДІДАС. Археагр. каміс. Дзярж. кам. па арх. і справаводству Рэсп. Беларусь. БДУ. Гіст. фак. ; Склад.: У. І. Адамушка, Э. М. Давыдава, Р. П. Платонаў, Я. Я. Янушкевіч. Мн.: БелНДІДАС, 2001. С. 170–173.
26. Рыбакоў А. Я. Арганізацыя дзяржаўнага архіва Вялікага княства Літоўскага ў канцы XV–XVII ст. // Архівы і справаводства. 1999. № 2. С. 70–76.
27. Хорошкевич А. Л. Проблемы издания Литовской метрики и первая белорусская публикация // Балты и Великое княжество Литовское / [редколл. Е. Л. Назарова (отв. ред.) и др.]. М.: Новое издательство, 2007. С. 28–43.
28. Mikulski W. Dokumenty z archiwum WXL w archiwum warszawskim Radziwiłłów // Miscellanea Historico-Archivistica. T. VII. 1997. P. 71–83.